**В.П. Знавец, А.В. Солахаў**
**(**Мазыр, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна)

# ПРЫЁМЫ ЎЗАЕМАПРАВЕРКІ ДАМАШНЯГА ЗАДАННЯ ПА ЛІТАРАТУРНЫМ ЧЫТАННІ МАЛОДШЫМІ ШКОЛЬНІКАМІ

Праверка выканання малодшымі школьнікамі дамашняга задання па літаратурным чытанні – важны і неад'емны этап урока літаратурнага чытання. Рэгулярнасць і якаснасць яго выканання шмат у чым залежыць ад спосабаў і форм праверкі.

Тым не менш, як паказваюць назіранні за працай настаўнікаў, аналіз метадычных дапаможнікаў па літаратурным чытанні, гэтаму этапу працы на ўроку літаратурнага чытання не надаецца належнай увагі. Звычайна настаўнік выклікае 5–7 вучняў для праверкі дамашняга задання, а большая частка вучняў застаецца не выслуханай ім. Мала таго, у час апытвання іншых вучняў яна бяздейнічае. Таму і да выканання дамашніх заданняў вучні адносяцца несур'ёзна: нашто вучыць – настаўнік усё роўна адказваць не выкліча. У метадычных дапаможніках па літаратурным чытанні для праверкі выканання дамашняга чытання прапануюцца прыёмы аднатыпнага характару, а на многіх уроках такая праверка ўвогуле адсутнічае. Калі настаўнік не валодае прыёмамі праверкі дамашняга задання, калі адсутнічае сістэма праверкі дамашняга задання, праверка праводзіцца ад выпадку да выпадку, самастойная дамашняя праца вучня губляе сэнс, абясцэньваецца і не прыносіць карысці.

Разгледзім некалькі арыгінальных, цікавых і, галоўнае, эфектыўных форм і метадаў узаемаправеркі выканання малодшымі школьнікамі дамашняга задання па літаратурным чытанні.

Узаемаправерка – форма кантролю, пры якой вучні аб'ектыўна ацэньваюць працу сваіх аднакласнікаў, г. зн. фактычна выступаюць у ролі настаўнікаў. Для такой працы пераважная большасць з іх псіхалагічна гатова: ім вельмі хочацца пабыць у ролі настаўніка.

Тут важна, каб вучні навучыліся ацэньваць працу аднакласнікаў не механічна, а змаглі абгрунтаваць сваю адзнаку.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Пры праверцы выканання малодшымі школьнікамі дамашняга задання на ўроках літаратурнага чытання могуць выкарыстоўвацца розныя спосабы і прыёмы ўзаемаправеркі, якія павышаюць цікавасць вучняў да вывучэння твораў мастацкай літаратуры і фальклору.

Узаемаправерка можа ажыцяўляцца ў парах, у групах, па варыянтах, па радах і інш.

Як паказвае эксперыментальная праца на ўроках літаратурнага чытання ў пачатковай школе, вучні лёгка спраўляюцца з наступнымі відамі ўзаемаправеркі:

– чытанне вершаванага або празаічнага тэксту;

– пераказ празаічнага твора (казкі, апавядання) або яго часткі;

– расказванне верша на памяць;

– адказы на пытанні па змесце прачытанага твора, якія вучні рыхтуюць самастойна;

– складанне плана тэксту і інш.

Найбольш эфектыўным прыёмам узаемаправеркі зарэкамендавала дзелавая **гульня «Настаўнік – вучань»**, таму што дазваляе за кароткі час (5–7 мін.) праверыць якасць выканання дамашняга задання ва ўсіх вучняў.

Яна пачынаецца з размеркавання роляў вучняў. Вучні, якія сядзяць за адной партай, аб'яўляюцца: справа – «настаўнікамі», злева – «вучнямі». На працягу 2–4 хвілін «вучні» адказваюць дамашняе заданне сваім «настаўнікам».

«Настаўнікі» ўважліва выслухоўваюць адказы «вучняў», выстаўляюць адзнакі на спецыяльна прыгатаваных картках (лістках) і каменціруюць іх «вучню», затым лісткі паказваюць або здаюць настаўніку.

Пасля гэтага вучні мяняюцца ролямі. У другой частцы гульні паўтараюцца тыя ж самыя дзеянні, што і на папярэднім этапе.

У якасці заключнай часткі гульні выкарыстоўваюцца:

а) узорны адказ ля дошкі: два–тры вучні па чарзе паўторна адказваюць дамашняе заданне для ўсяго класа (кантроль збоку настаўніка);

б) інтэлектуальная размінка: два–тры чалавекі выходзяць да дошкі, клас задае ім пытанні па дамашнім матэрыяле, выкліканыя вучні па чарзе адказваюць на іх;

в) водгукі «настаўнікаў» пра адказы «вучняў»: «настаўнік», уважліва выслухаўшы адказ «вучня», рыхтуе водгук, адзначае вартасці і недахопы адказу, дапаўняе і пашырае яго;

г) рэкамендацыі «настаўнікаў» сваім «вучням»: «настаўнікі» пасля праслухоўвання «вучняў» даюць рэкамендацыі па падрыхтоўцы дамашняга задання.

Выкарыстанне гульні «Настаўнік – вучань» пры праверцы дамашніх заданняў па літаратурным чытанні і яе аналіз дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1. Малодшыя школьнікі больш адказна ставяцца да выканання дамашніх заданняў, прымаюць рашэнне – рэгулярна рыхтавацца да ўрокаў, знаходзяць пэўную ступень упэўненасці ў сабе.

2. Дадзеная гульня дае магчымасць у цікавай, займальнай форме праверыць дамашні матэрыял, спрыяе свядомаму і больш глыбокаму засваенню ведаў вучнямі, выклікае ў іх цікавасць да чытання. Яна дазваляе за параўнальна кароткі час не толькі праверыць дамашняе заданне, але і правесці аўдзіраванне – уважліва выслухаць суседа, параўнаць свой адказ з яго адказам. Ад урока да ўрока ўзрастае актыўнасць дзяцей.

3. Выкарыстанне гульні «Настаўнік – вучань» на ўроках дазваляе далучаць да працы ўсіх дзяцей, тым самым павялічваючы шчыльнасць урока. Сарамлівыя, закамплексаваныя, малагаваркія вучні пры праверцы дамашняга задання выяўляюць свае ўменні, становяцца даверлівымі і раскаванымі. Кожны вучань вучыцца супрацоўнічаць з суседам па парце, выказваць сваё меркаванне, аналізаваць і ацэньваць дзейнасць таварыша. У гульні актыўна фарміруюцца маўленчыя ўменні, навыкі чытання, гаварэння, слухання.

4. Гульня «Настаўнік – вучань» спрыяе фарміраванню асноўных кампетэнтнасцей вучняў:

– матываванасці вучняў на ўважлівае вывучэнне літаратурных твораў, раскрыццё характараў іх герояў;

– развіцця навыкаў аналізу, сінтэзу, параўнання, вылучэння галоўнага;

– развіцця логікі і крэатыўнасці мыслення;

– фарміравання ўменняў да самавыяўлення асобы вучня.

МГПУ им. И.П. Шамякина

5. Гульня дапамагае вучням усвядоміць некаторыя асаблівасці рэальных адносін паміж вучнямі і іх настаўнікам.

6. У працэсе гульні выхоўваецца асоба, якая валодае пэўнымі ведамі і ўменнямі, а таксама якая мае здольнасць да самааналізу і да бесперапыннай самаадукацыі.

**«Бліц-апытанне па ланцужку»** – прыём, пры якім, падрыхтаваўшы пытанне дома, першы вучань задае яго другому, другі – трэцяму, трэці – чацвёртаму і так далей, пакуль не дойдзе чарга да апошняга вучня. Апошні вучань задае пытанне першаму вучню – кола замыкаецца. На адказ даецца некалькі секунд. Настаўнік кантралюе апытанне і, калі пытанне не адпавядае тэме або недастаткова карэктнае, мае права яго зняць. Кожны вучань мае права адмовіцца ад удзелу ў бліц-апытанні, але павінен паведаміць аб гэтым настаўніку загадзя, на перапынку.

Варыянтамі такой узаемаправеркі дамашняга задання з’яўляюцца:

а) спаборніцтва паміж вучнямі трох груп (па радах) на час (якая з груп, не перарываючы ланцужок, правільна і хутчэй за іншых адкажа на пытанні). Настаўнік кантралюе правільнасць адказаў і час, за які вучні справяцца з адказамі на пытанні;

б) дзяўчынкі задаюць пытанні хлопчыкам, хлопчыкі – дзяўчынкам;

в) вучні 1-га варыянту задаюць пытанне вучням 2-га варыянту, вучні 2-га – вучням 1-га;

г) вучні 1-га рада задаюць пытанні вучням 2-га рада, вучні 2-га рада – вучням 3-га рада, вучні 3-га рада – вучням 1-га рада.

Падрыхтоўка вучняў да бліц-апытання вучыць іх уважліва ставіцца да зместу мастацкага твора, правільна фармуляваць пытанне і прамаўляць яго з патрэбнай інфармацыяй.

**Камандная гульня «Знайдзі памылку»** заключаецца ў пошуку адной камандай слоў, памылкова ўжытых у мастацкім тэксце, які на аснове вывучанага твора рыхтуе другая каманда. Для гэтага кожная каманда рыхтуе дома адпаведны тэкст з заменай слоў у тэксце і прапануе знайсці іх іншай камандзе. Важнае значэнне ў гэтай гульні мае элемент спаборніцтва, які значна павышае актыўнасць малодшых школьнікаў.

**«Трэніроўка памяці і ўважлівасці»** – гэта вельмі цікавы прыём, ён асабліва эфектыўны, калі вучні будуць гатовы працаваць з ім. Неабходна папярэдзіць іх загадзя, каб яны ўважліва прачыталі зададзены для дамашняй працы тэкст.

На ўроку настаўнік прапануе вучню прачытаць запісаны на дошцы тэкст, у якім асобныя словы прыкрыты лісткамі паперы і з якім дзеці працавалі дома. Вучань аднаўляе тэкст па памяці. Клас сочыць за тэкстам па падручніку і ацэньвае аднакласніка.

У якасці прыкладу прыводзім апавяданне Паўла Кавалёва «Падзяка»

*Да прыпынку падышоў ___________. Дзіма разам з маці зайшоў праз пярэднія ___________. На першых крэслах сядзелі маладыя людзі. Яны адразу ж ___________, каб даць месца Дзіму і яго маці.*

*Аўтобус крануўся. Праз два ці тры прыпынкі ў аўтобус зайшла ___________ . Дзіма хуценька ўсхапіўся з крэсла, каб ___________ бабуля.*

*— Дзякуй табе, унучак, — сказала тая і ___________ .*

*Калі даехалі да свайго ___________ і выйшлі з аўтобуса, Дзіма спытаў:*

*— Мама, а за што кажуць дзякуй?*

*— За ўсе добрыя справы, за ___________ да людзей, — адказала маці. — І табе бабуля падзякавала за тое, што ты ёй, старэнькай, месца ўступіў.*

*Дзіма заўсміхаўся. Яму ўпершыню сказалі ___________.*

Прыём «трэніроўка памяці і ўважлівасці» можна рэалізаваць і ў наступнай форме: настаўнік дае вучням ліст, на якім пасярэдзіне размешчаны тэкст або частка верша з прапушчанымі словамі. Вучням патрэбна за пэўны адрэзак часу ўставіць прапушчаныя словы. Але гэты варыянт можна выкарыстоўваць толькі ў 3–4 класах.

Выкарыстанне дадзенага прыёму пры праверцы дамашняга задання будзе садзейнічаць развіццю ў вучняў адказнасці і зрокавай памяці. А пры падрыхтоўцы дамашняга задання вучні будуць чытаць тэкст больш старанна і ўважліва.

**«Даведайся пра мяне»** – так называецца прыём, які заключаецца ў тым, што на ўроку літаратурнага чытання настаўнік прапаноўвае вучням выступіць ад імя літаратурнага героя. Гэта можа быць герой (персанаж) казкі або апавядання.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Расказваючы, вучань не называе літаратурнага героя, а толькі апісвае яго ўчынкі, пачуцці, разважанні. Астатнія вучні слухаюць паведамленне-загадку аднакласніка і адгадваюць імя героя (персанажа).

Можна таксама прапанаваць вучням карткі, на якіх напісаны словы, што характарызуюць каго-небудзь з герояў твора. Вучням патрэбна вызначыць, да каго адносіцца гэта характарыстыка, і даказаць гэта сваімі словамі або радкамі з тэксту.

Пры арганізацыі **гульні «Пяцёрачка»** клас дзеліцца на групы па пяць чалавек. Вучні адказваюць дамашняе зададанне сваім таварышам па групе. Той, хто адкажа першы, становіцца капітанам групы. Ён уважліва выслухоўвае адказы вучняў сваёй групы, а потым пры ўсім класе коратка аналізуе адказы вучняў групы.

Такім чынам, на сучасным этапе развіцця адукацыі сам працэс перадачы ведаў ад настаўніка да вучня не мае такога вялікага значэння, якое ён меў раней. Галоўнай умовай эфектыўнага навучання вучняў становяцца прыёмы самакантролю і саманавучання, г. зн. перад настаўнікам стаіць задача вучыць малодшых школьнікаў вучыцца. Зрабіць гэта немагчыма, калі не арганізаваць сістэмную працу па праверцы выканання дамашніх заданняў з выкарыстаннем эфектыўных прыёмаў узаемаправеркі, якія актывізуюць разумовую дзейнасць вучняў, павялічваюць самастойнасць, нараджаюць і захоўваюць матывацыю рэгулярна і якасна выконваць дамашнюю працу.

МГПУ им. И.П.Шамякина